**В. С. Дзянісенка**[1], **Т. А. Марозава**[2]

УДК 398:378.147.091.33-027.22

[1]Вучэбна-навуковая лабараторыя беларускага фальклору кафедры тэарэтычнага і беларускага літаратуразнаўства, філалагічны факультэт, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск, Рэспубліка Беларусь

[2]Кафедра тэарэтычнага і беларускага літаратуразнаўства, філалагічны факультэт, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск, Рэспубліка Беларусь

# АДУКАЦЫЙНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ ФАЛЬКЛОРНАЙ ПРАКТЫКІ Ў КАНТЭКСЦЕ ПРАФЕСІЙНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ ФІЛОЛАГАЎ: ВОПЫТ ВУЧЭБНА-НАВУКОВАЙ ЛАБАРАТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА ФАЛЬКЛОРУ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА

У артыкуле акцэнтуецца ўвага на асаблівасцях нефармальнага вывучэння фальклорных матэрыялаў у межах актыўных навучальных практык, накіраваных на фарміраванне ў студэнтаў-філолагаў якасных прафесійных кампетэнцый, якія ўключаюць метадалагічную падрыхтоўку і даследчую дзейнасць.

**Ключавыя словы**: фальклорная практыка; Фонд фальклорных матэрыялаў; беларускі фальклор; вучэбна-навуковая лабараторыя беларускага фальклору; фальклорны твор; фальклорная адзінка.

**Узор цытавання:** Дзянісенка, В. С. Адукацыйны патэнцыял фальклорнай практыкі ў кантэксце прафесійнай падрыхтоўкі філолагаў: вопыт вучэбна-навуковай лабараторыі беларускага фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта / В. С. Дзянісенка, Т. А. Марозава // София: электрон. науч.-просветит. журн. – 2025. – № 2. – С. 55–59.

**V. Dzianisenka**[1], **T. Marozava**[2]

[1]Educational and Scientific Laboratory of Belarusian Folklore, Department of Theoretical and Belarusian Literary Studies of the Faculty of Philology, Belarusian State University, Minsk, Republic of Belarus

[2]Department of Theoretical and Belarusian Literary Studies, Faculty of Philology, Belarusian State University, Minsk, Republic of Belarus

# THE EDUCATIONAL POTENTIAL OF FOLKLORE PRACTICE IN THE CONTEXT OF THE PROFESSIONAL TRAINING OF PHILOLOGISTS: THE EXPERIENCE OF THE EDUCATIONAL AND SCIENTIFIC LABORATORY OF BELARUSIAN FOLKLORE OF BELARUSIAN STATE UNIVERSITY

The article focuses on the importance of informal study of folklore materials within the framework of active educational practices aimed at the formation of high-quality professional competencies among philology students, including methodological training and research activities.

**Keywords**: folklore practice; Folklore Materials Fund; Belarusian folklore; educational and scientific laboratory of Belarusian folklore; folklore work; folklore unit.

**For citation:** Dzianisenka V. & Marozava T. The Educational Potential of Folklore Practice in the Context of the Professional Training of Philologists: the Experience of the Educational and Scientific Laboratory of Belarusian Folklore of Belarusian State University. Sophia. 2025;2:55–59. Belaru sian.

**Аўтары:**

[1] **Вера Сяргееўна Дзянісенка** – загадчык вучэбна-навуковай лабараторыі беларускага фальклору кафедры тэарэтычнага і беларускага літаратуразнаўства філалагічнага факультэта БДУ.

*nutbolt@yandex.by*

**Authors:**

**Vera Dzianisenka** – Head of the Educational and Scientific Laboratory of Belarusian Folklore, Department of Theoretical and Belarusian Literary Studies of the Faculty of Philology of BSU.



[2] **Таццяна Анатольеўна Марозава** – кандыдат філалагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры тэарэтычнага і беларускага літаратуразнаўства філалагічнага факультэта БДУ.

*morota2012@yandex.by*

**Tatsiana Marozava** – PhD in Philology, Docent, Head of the Department of Theoretical and Belarusian Literary Studies of the Faculty of Philology of BSU.



Фальклор як унікальная з’ява нацыянальнай культуры прадстаўляе сабой шматграннае адзінства гістарычнага вопыту, моўнай спецыфікі і ментальных асаблівасцей таго ці іншага народа. У межах філалагічных і культуралагічных даследаванняў ён выступае ў якасці складанага феномена, які інтэгруе пэўныя сацыякультурныя, лінгвістычныя і гістарычныя вымярэнні, тым самым падкрэсліваючы сваю асаблівую значнасць для вывучэння моўнай, культурнай і сацыяльнай дынамікі ў дыяхранічным і сінхранічным зрэзе.

Так, важным складнікам фарміравання прафесійных кампетэнцый студэнтаў-філолагаў з’яўляецца азнаямляльная фальклорная практыка на базе вучэбна-навуковай лабараторыі беларускага фальклору (далей – ВНЛБФ) кафедры тэарэтычнага і беларускага літаратуразнаўства, якая праводзіцца на філалагічным факультэце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (далей – БДУ).

Асабліва важнай у межах дадзенай формы вучэбнай дзейнасці з’яўляецца праца з архіўнымі калекцыямі Фонду фальклорных матэрыялаў лабараторыі. Гэты працэс уключае ў сябе знаёмства з фальклорнымі тэкстамі розных рэгіёнаў Беларусі, запісанымі студэнтамі філалагічнага факультэта БДУ непасрэдна ў палявых умовах, гэта

значыць у рэальных умовах бытавання і функцыянавання фальклорнай адзінкі, а таксама з варыятыўнасцю і асаблівасцямі лакальных традыцый.

Такім чынам у рамках індывідуальнага задання ў студэнтаў-практыкантаў філалагічнага факультэта БДУ фарміруюцца навыкі крытычнай ацэнкі палявых назіранняў, правядзення інтэрв'ю з носьбітамі вуснай традыцыі, а таксама ўменне аналізаваць архіўныя запісы Фонду фальклорных матэрыялаў лабараторыі з пункту гледжання сучаснай фалькларыстыкі.

Значную практычную складанасць уяўляе атрыбуцыя жанравай прыналежнасці фальклорных твораў асабліва ў выпадках некарэктнага вызначэння або адсутнасці пазнак, якія мог пакінуць збіральнік, што вымагае ад практыкантаў прымянення тэарэтычных ведаў па фалькларыстыцы і навыкаў уважлівага аналізу фальклорнага матэрыялу. Для гэтага неабходна выявіць і асэнсаваць наступныя фармальна-змястоўныя маркеры:

- кампазіцыйныя асаблівасці фальклорнага твора: структуру тэксту, парадак элементаў, паўторы, наяўнасць рэфрэнаў і інш.;
- стылістычныя рысы: моўныя сродкі, метафорыку, рытміку і інш.;
- адметнасці сюжэтна-матыўнага аналізу – тыповыя сюжэты і матывы фальклорнага тэксту.

Гэты этап работы спрыяе развіццю ў студэнтаў практычных навыкаў тэксталагічнага аналізу фальклорнага твора і паглыбленню разумення жанрава-відавой сістэмы беларускага фальклору, што, у сваю чаргу, з'яўляецца ядром прафесійнай падрыхтоўкі філолагаў і фалькларыстаў.

Акрамя таго, праца з архіўнымі (гэта значыць першаснымі) фальклорнымі матэрыяламі стымулюе ў студэнтаў сістэматызацыю ведаў, фарміраванне лагічнай паслядоўнасці аналізу, а таксама ўменне аперыраваць спецыяльнай тэрміналогіяй і спасылацца на архіўныя і аўтарытэтныя навуковыя крыніцы. Гэта спрыяе развіццю практычных навыкаў працы з крыніцамі, вядзення дакументацыі, апрацоўкі матэрыялаў, усведамленню важнасці навуковай аргументацыі, а таксама спрыяе фарміраванню адказнасці і матывацыі да далейшых самастойных даследаванняў.

Не выклікае сумнення, што фальклор як вусная традыцыя ўяўляе сабой складаны культурны і лінгвістычны феномен, які патрабуе глыбокага разумення яго моўных структур, семантычных асаблівасцей і стылістычных прыёмаў. Пры гэтым асаблівае значэнне набывае вывучэнне не толькі вуснай традыцыі, але і пісьмовай фіксацыі саміх фальклорных тэкстаў. Так, у рамках правядзення фальклорнай практыкі на базе ВНЛБФ рэгіянальны фальклор выступае адначасова як прыклад спецыфічнага лакальнага культурнага кода і як аб'ект лінгвістычнага даследавання.

Рэгіянальны фальклор – гэта сканцэнтраваны моўны локус, што ўключае ў сябе архаізмы, рэгіяналізмы, словы і канструкцыі, якія страцілі літаратурнае ўжыванне або ўнікальныя фанетычныя і марфалагічныя асаблівасці. З улікам гэтага знаёмства з лакальнымі рэаліямі фальклорнай традыцыі выклікае неабходнасць фарміраваць у студэнтаў-практыкантаў спецыяльны алгарытм для інтэрпрэтацыі нестандартных, а часам і зусім незнаёмых моўных адзінак. Тым самым можна сцвярджаць, што знаёмства студэнтаў-філолагаў з дыялектнымі асаблівасцямі беларускага фальклору ўяўляе сабой не проста індывідуальнае акадэмічнае заданне, а канкрэтную навукова-практычную задачу, накіраваную на засваенне інтэгратыўных методык, якія дазваляюць раскрываць глыбінныя ўзаемасувязі мовы, культуры і гісторыі таго ці іншага рэгіёна Беларусі.

Падкрэслім, што для правядзення якаснага даследавання неабходнымі з'яўляюцца навыкі працы з аўдыязапісамі, філалагічная транскрыпцыя, заўвагі і каментарыі падчас інтэрв'ю ў сітуацыйным маўленні, дзе сустракаюцца адмысловыя выпадкі фанетычных асаблівасцей і спецыфічных сінтаксічных канструкцый. Такім чынам знаёмства з рэгіянальным фальклорам Беларусі з'яўляецца сапраўдным філалагічным «выпрабаваннем» для студэнтаў, бо ім неабходна адаптаваць класічныя метады лінгвістычнага аналізу да пэўных фальклорных рэалій.

Падчас азнаямляльнай фальклорнай практыкі 2024–2025 навучальнага года на базе ВНЛБФ студэнты праходзілі стадыю транскрыбацыі і аналізу вусных фальклорных тэкстаў, запісаных у Пружанскім раёне Брэсцкай вобласці ў час фальклорных экспедыцый у 1968, 1970, 1972, 1978, 1983, 1986–1987, 1991, 1997 гг. Асаблівая ўвага надавалася ідэнтыфікацыі ў розных фальклорных жанрах заходне-беларускіх дыялектных маркераў – фанетычных, марфалагічных, лексічных і сінтаксічных асаблівасцей. У сваю чаргу, гэта дазволіла вызначыць іх спецыфіку ў залежнасці ад камунікатыўнай сітуацыі і жанрава-відавой прыналежнасці фальклорнай адзінкі.

Важна таксама адзначыць, што фальклорная практыка на базе ВНЛБФ спрыяе развіццю ў студэнтаў навыкаў крытычнай інтэрпрэтацыі не толькі тэкставага, але і паралінгвістычнага матэрыялу – інтанацыя, паўзы, эмацыянальная афарбоўка, тэмп маўлення і інш. Аналіз гэтых элементаў дазваляе глыбей зразумець асаблівасці камунікатыўных паводзін носьбітаў рэгіянальнай фальклорнай традыцыі, што з'яўляецца істотным для філалагічнага даследавання.

Такім чынам, комплексны падыход да вывучэння архіўных фальклорных запісаў спрыяе паглыбленню ў студэнтаў-філолагаў уяўлення аб дыялектнай спецыфіцы і пашырэнню разумення кантэксту функцыянавання фальклору ў пэўным сацыяльным асяроддзі.

Далейшае ўзбагачэнне прафесійнага інструментару філолага падчас правядзення фальклорнай практыкі дасягаецца за кошт інтэграцыі ведаў з сумежных гуманітарных дысцыплін – гісторыі, культуралогіі, псіхалогіі. Асабліва каштоўным з'яўляецца тое, што ў працэсе працы з архіўнымі матэрыяламі студэнты-практыканты вучацца бачыць фальклор як дынамічную з'яву, здольную трансфармавацца пад уплывам пэўных сацыяльных, гістарычных і культурных фактараў. Тым самым гэта садзейнічае актуалізацыі праблемы захавання і папулярызацыі нацыянальнай культурнай спадчыны ў грамадстве.

Разам з тым сучасная фалькларыстычная навука актыўна асвойвае інавацыйныя метады, у прыватнасці лічбавую апрацоўку і сістэматызацыю фальклорных тэкстаў. Стварэнне электронных архіваў і баз даных становіцца неад'емнай і неабходнай часткай навукова-даследчай працы, забяспечваючы даступнасць і захаванасць культурных матэрыялаў, а таксама пашыраючы магчымасці для іх комплекснага лінгвакультурнага аналізу. Безумоўна, гэтыя фактары адкрываюць новыя гарызонты для філалагічных даследаванняў.

У якасці індывідуальнага задання студэнты-практыканты спецыяльнасцей «руская філалогія» і «славянская філалогія» ў 2024–2025 навучальным годзе ажыццяўлялі рэтраканверсію фальклорных тэкстаў вопісу Пружанскага раёна рэгіянальнага архіва Брэсцкай вобласці. Праца заключалася ва ўважлівым вывучэнні фальклорнага твора, расшыфроўцы рукапіснага тэксту і пераводзе інфармацыі ў электронны выгляд.

Кожная фальклорная картка змяшчала наступнае:

- запіс тэксту фальклорнай адзінкі;
- інфармацыю пра збіральніка, час і месца запісу;
- звесткі аб інфарманце, а таксама розныя каментарыі і пазнакі.

Заключным этапам працы была праверка і верыфікацыя ўведзеных даных для мінімізацыі памылак.

Такім чынам, вывучэнне фальклору выходзіць далёка за межы традыцыйнага разумення яго як вуснай культурнай спадчыны народа. Ён становіцца ключавым аб’ектам разнастайных міждысцыплінарных даследаванняў, тым самым дазваляе інтэграваць атрыманыя веды ў сучасны адукацыйны кантэкст. А азнаямляльная фальклорная практыка не толькі дапаўняе тэарэтычныя філалагічныя дысцыпліны, але і выконвае важную выхаваўчую функцыю, фарміруе ў студэнтаў-практыкантаў пачуццё адказнасці за захаванне нацыянальнай культурнай ідэнтычнасці і развіццё айчыннай філалогіі, стварае аснову і выступае «каталізатарам» матывацыі да самастойных даследаванняў, што спрыяе павышэнню якасці падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў, гатовых да вырашэння комплексных задач у галіне гуманітарных ведаў.